**МІНСК**

# *Старшыні СНК БССР, сакратару ЦК КП(б)Б таварышу П. К. ПАНАМАРЭНКА*

Натхнёныя перамогамі Чырвонай Арміі, мы, трактарысты Цімкавіцкай МТС, Бабруйскай вобласці, уключыліся ў агульнасаюзнае сацыялістычнае спаборніцтва МТС за высокі ўраджай і бярэм на сябе абавязацельства ўзараць на трактары ХТЗ за сезон 2.000 гектараў.

За першыя 4 дні палявых работ мы ўзаралі на сваім трактары 76 гектараў. Тэмпы нашай работы з кожным днём павышаюцца.

Мы запэўніваем наш урад і ЦК партыі ў тым, што ўзятыя намі абавязацельствы будуць выкананы. Мы працуем з усведамленнем таго, што наша работа дапамагае фронту паскараць канчатковую перамогу над гітлераўскай Германіяй.

**Трактарысты Цімкавіцкай МТС Васіль ЛОБАН, ВАСІЛЬ САКАЛОЎСКІ.**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ